# Стымулюючыя заняткі па беларускай мове для вучняў 10-11 класаў

**Аксана Іосіфаўна Ванчук,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
гімназіі №1 Дзятлава

**Стымулюючыя заняткі – гэта дадатковыя заняткі, накіраваныя не толькі на адпрацоўку ведаў вучняў па тэме, але і на развіццё творчых здольнасцяў моцных вучняў. Прапанаваны матэрыял можа быць выкарыстаны настаўнікамі пры падрыхтоўцы да ЦЭ і да алімпіяды па беларускай мове. Вучні змогуць паўтарыць і замацаваць веды па тэме “Спосабы ўтварэння слоў”, паразважаць над паняццямі “шчасце”, “шчаслівы чалавек”, супаставіць сваё ўяўленне пра шчасце з уяўленнямі вядомых паэтаў, філосафаў свету. Стымулюючыя заняткі будуць спрыяць абуджэнню ў старшакласнікаў цікавасці да асноўных пытанняў чалавечага быцця, жадання імкнуцца да сапраўдных каштоўнасцей.**

## Спосабы ўтварэння слоў
## Стымулюючыя заняткі па беларускай мове для вучняў 10-11 класаў

**Мэты і задачы**: спрыяць пашырэнню ведаў вучняў пра асноўныя спосабы словаўтварэння, словаўтваральныя нормы сучаснай беларускай мовы; адпрацоўваць навыкі пісьма; стварыць умовы для разумення вучнямі асэнсавання сутнасці паняццяў “шчасце” і “шчаслівы чалавек”; даць вучням магчымасць супаставіць сваё ўяўленне пра шчасце з уяўленнямі вядомых паэтаў, філосафаў свету; спрыяць абуджэнню ў старшакласнікаў цікавасці да асноўных пытанняў чалавечага быцця, жадання імкнуцца да сапраўдных каштоўнасцей.

**Эпіграф:**

Сцяжынак многа і дарог, як выбраць тую, што вядзе да шчасця? Анатоль Балуценка.

### Ход заняткаў

**І. Арганізацыйны этап**

**Настаўнік**. Паслухайце прытчу.

Бог зляпіў чалавека з гліны, і застаўся ў яго руках невялікі камяк.

-Што яшчэ зляпіць табе? – спытаў Бог.

-Зляпі мне шчасце, - папрасіў чалавек.

Нічога не адказаў Бог, толькі моўчкі паклаў чалавеку ў далонь лішні камяк гліны.

Як вы лічыце, што азначае маўчанне Бога? *Адказы вучняў.*



ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

Сёння ў нас незвычайныя стымулюючыя заняткі: урок-роздум над пытаннямі “Што такое шчасце? Каго можна назваць шчаслівым чалавекам?”

**“Лексічная хвілінка”.** Прапаную вам звярнуцца да “Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы” і адшукаць лексічнае значэнне слоў “шчасце”, “шчаслівы”.

**З “Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы”**

**Шчасце –** 1. Стан поўнай задаволенасці жыццём; пачуццё найвялікшай радасці і задавальнення. 2. Удача, поспех у чым-небудзь. Шчаслівы выпадак. 3. Лёс, доля.

**Шчаслівы –** 1. Поўны шчасця; такі, якому спадарожнічае поспех, удача. 2. Такі, які прыносіць шчасце, удачу.

**Настаўнік**. Самае частае і добрае пажаданне, з якім чалавек звяртаецца да чалавека, – пажаданне шчасця. А ці задумваліся вы, што такое шчасце? Сёння на ўроку прапаную вызначыць, які сэнс уклалі ў слова “шчасце” вядомыя беларускія паэты, і супаставіць са сваім ўяўленнем.

*Заданні на картках.* Прачытайце верш і вызначце, у чым заключаецца шчасце для паэта (у залежнасці ад колькасці вучняў, можа быць арганізавана работа ў парах або індывідуальна). Складзіце выказванне 10–12 сказаў, абапіраючыся на зробленыя высновыя пасля знаёмства з вершамі.

**1 картка**

**Уладзімір Папковіч “Шчасце”**

А шчасце ж простае зусім, –
Збіраем тое, што пасеем.
Яго дарүе Бог усім,
Мы толькі браць яго не ўмеем.
Калі на вуліцу са сцен
Свайго жытла выходзіш зранку,
Скажы суседу:”Добры дзень!”
І дворніку з мятлой на ганку.
Пачуеш ветлівы адказ,
І чалавек табе ўсміхнецца,
І шчасце ўжо на нейкі час
З табою разам застанецца.
Зірнеш на неба, і яно
Святлом заззяе асаблівым,
І ты адчуеш, што даўно
Ужо не быў такім шчаслівым.

**2 картка**

**Юрась Свірка «Шчасце»**

Пра шчасце ў дзяўчынкі спыталі.



NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

Дзе шчасце, спыталі ў яе.
А шчасце – блакітная далеч.
А шчасце – што птушка пяе.
А шчасце – пабегчы сцяжынкай,
дзе сінню цвітуць васількі;
лічыць на далонях дажджынкі
і плесці над рэчкай вянкі.
А шчасце – з сябрамі на ўроку адказ у задачы знайсці.
Дадому паспешлівым крокам да роднай матулі ісці.
А шчасце – плыць ціха на лодцы сярод беласнежных лілей.
А шчасце – у роднай старонцы, якая за ўсё даражэй

**3 картка**

**Максім Танк "Шчасце"**

Простае шчасце людское,
Так, як і наша з табою,
Пэўна, складаецца з солі,
З хлеба, сабранага ў полі,
З поту, з дарожнага пылу,
З роднага небасхілу,
З дружбы, мацнейшай ад смерці,
З песні...
І так мне здаецца:
Каб з чаго іншага скласці,
Дык ці было б яно шчасцем?

*Праверка выкананых заданняў.*

**Настаўнік.** Кажуць, што шчасце – гэта ўнутраны стан чалавечай душы, які не залежыць ад знешняга жыцця – ад абставін. Чалавецтва стагоддзямі ганяецца за прывідным шчасцем, не разумеючы, што яно ўвесь час побач, яно ў нас. Шчасце складаецца з дробязей, на якія часта мы не звяртаем увагі. Мне вельмі хочацца, каб сённяшнія заняткі дазволілі вам адчуць сябе шчаслівымі людзьмі.

*Індывідуальныя заданні.*

**А)** Выканайце, калі ласка, наступнае вуснае заданне. Працягніце сказы.

1. Чалавек шчаслівы толькі тады, … ( калі ў яго ёсць мара, да здзяйснення якой ён імкнецца).

2.Жыццё даецца, … ( …каб жыццё тварыць)

**Настаўнік.** Я ўпэўнена, што пачатак 2 сказа вы пазналі. Так, сапраўды, як казаў А. Вярцінскі: "Жыццё даецца, каб жыццё тварыць. Надзеяй, праўдай, мужным парываннем, высакародным дружным намаганнем, што потым зоркай у вяках гарыць".



ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

**Б)** Кожны разумее шчасце па-свойму. А як жа разумеюць яго вядомыя ва ўсім свеце людзі? Пераклаўшы выказванні з рускай мовы пра шчасце, мы будзем мець магчымасць даведацца, як гэтыя выказванні гучаць па-беларуску.

Пераклад з рускай мовы выказванняў знакамітых людзей.

Есть два желания, исполнение, которых может составлять истинное счастье человека, – быть полезным и иметь спокойную совесть (Л. Толстой).

Счастлив, трижды счастлив человек, которого невзгоды жизни закаляют (Ж. Фабр).

Самые прекрасные и в то же время счастливые люди те, кто прожил жизнь, заботясь о счастье других (В. Сухомлинский).

Из всех путей, которые ведут к счастью, самые верные – труд и упорство (Л. Рейбо).

Самый счастливый человек тот, кто дарит счастье наибольшему числу людей (Д. Дидро).

*Праверка заданняў.*

**Настаўнік.** Вы – моладзь Беларусі, менавіта ад вас залежыць будучыня нашай краіны. Якую прафесію не выбралі б, павінны заўсёды імкнуцца стаць адукаванымі людзьмі, добрымі спецыялістамі. Вашы сталыя веды дапамогуць здзейсніць мары і зрабіць значны ўклад у развіццё нашай краіны. Вы – будучыня нашай краіны, толькі ад вас залежыць заўтрашні дзень. Любімая прафесія робіць чалавека шчаслівым. А стымулюючыя заняткі па беларускай мове будуць спрыяць вам у гэтым.

**II. Арганізацыйна-пазнаваўчы этап**

*Знаёмства з тэмай заняткаў.*

– Чаму неабходна ведаць гэту тэму? (Магчыма, каб правільна і прыгожа пісаць, чытаць, гаварыць; каб быць адукаваным чалавекам; каб паспяхова здаць ЦЭ і паступіць у абраную ВНУ.)

*Настаўнік чытае верш С. Дзяргая “А чаму б і не?”*

– Хіба ты ўсе тайны вызнаеш?..
Хіба ты ўсе думкі выснуеш?..
Хіба ты ўсе дзівы выглядзіш?
– А чаму б і не?..

Як вы зразумелі верш? На што накіроўвае паэт чытача?

**Тэарэтычная хвілінка**

**Настаўнік.** Словаўтварэнне – раздзел мовазнаўства, у якім вывучаецца будова слоў, спосабы і сродкі іх утварэння. Тэрмінам “словаўтварэнне” называюць і сам працэс утварэння слоў. Словы ўтвараюцца ад вядомых каранёў на пэўны ўзор. Веданне правілаў словаўтварэння, уменне вызначаць ролю і значэнне частак слова дапамагае пазбегнуць памылак ва ўжыванні слоў, спрыяе павышэнню пісьменнасці.



NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

Прапаную вам пачатак вызначэння мэтаў стымулюючых заняткаў, а вы, калі згодны з імі, дапоўніце.

*Мэты:*

Узнавіць…

Паглыбіць…

Замацаваць…

Навучыцца…

Выхаваць…

Пераходзім непасрэдна да нашай тэмы. Нагадаем, якія спосабы словаўтварэння вам вядомы? *Адказы вучняў.*

**Настаўнік**. Усе спосабы словаўтварэння ўмоўна падзяляюць на дзве групы: афіксальныя спосабы (пры іх словы ўтвараюцца з дапамогай афіксаў – прыстаўкі, суфікса, постфікса, інтэрфікса) і спосабы складання (новае слова ўтвараецца з двух і больш самастойных слоў). У кожнай групе вылучаюцца разнавіднасці спосабаў словаўтварэння.

Прапаную папрацаваць з табліцай і запісаць словы ў пэўныя калонкі, згодна з утварэннем. Абгрунтуйце свой выбар.

**Афіксальныя спосабы словаўтварэння**

| Спосаб | Каментарый | Прыклад |
|---|---|---|
| 1. Прыставачны | А) назоўнікі<br>Б) прыметнікі<br>В) дзеясловы<br>Г) прыслоўі<br>Д) займеннікі | |
| 2. Суфіксальны | Часцей суфіксальным спосабам утвараюцца словы іншай часціны мовы | |
| 3. Прыставачна-суфіксальны | А) назоўнікі<br>Б) прыметнікі<br>В) дзеясловы<br>Г) прыслоўі | |
| 4. Постфіксальны | А) займеннікі<br>Б) прыслоўі<br>В) зваротныя дзеясловы | |
| 5. Прыставачна-постфіксальны | Утвараюцца зваротныя дзеясловы закончанага трывання | |



NG PRESS ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

| | | |
|---|---|---|
| 6. Суфіксальна-постфіксальны | Утвараюцца зваротныя дзеясловы незакончанага трывання | |
| 7. Прыставачна-суфіксальна-постфіксальны | Утвараюцца зваротныя дзеясловы закончанага трывання | |
| 8. Бяссуфіксны | Утвараюцца назоўнікі ад дзеясловаў, прыметнікаў | |

*Нехта, нацярпецца, дзесьці, расшчодрыцца, падручны, уверсе, па-мойму, залетась, хтосьці, падумваць, стрыгчыся, забег, нешырокі, разбегчыся, мыцца, запіс, калі-небудзь, сувязіст, стартаваць, водаправодны, прыбярэжны, надвячорак, гарадскі, перагаворвацца, праўнук, знесці, палёт, абы-хто, ганарыцца, падбярозавік, паднавіць, назаўтра, вынесці, смяяцца, пазакласны.*

**Спосабы складання**

| Спосаб | Каментарый | Прыклад |
|---|---|---|
| 1. Словаскладанне | Новае слова ўтвараецца шляхам зліцця двух цэлых слоў (без злучальнай галоснай) | |
| 2. Асноваскладанне | Ад асноў двух слоў з дапамогай злучальнай галоснай | |
| 3. Асновасловаскладанне | Слова ўтвараецца ад асновы аднаго слова (1-я частка) і поўнага другога слова (2-я частка) | |
| 4. Складана-суфіксальны | Новае слова ўтвараецца ад дзвюх асноў з далучэннем суфікса | |
| 5. Абрэвіяцыя | Складанаскарочаныя словы | |

*Медсястра, кінатэатр, чатырохпавярховы, плытагон, камбат, БДУ, чарнаморскі, высокамастацкі, шэравокі, дом-музей, відэакамера.*

**Настаўнік**. Вядомы і такі спосаб, як пераход слоў з адной часціны мовы ў другую. Напрыклад, А) **Субстантывацыя,** -і, жаночы род. Пераход у разрад назоўнікаў іншых часцін мовы. Напрыклад, ваенны чалавек-ваенны (салдат), дзяжурны ўрач – дзяжурны (у класе), малое дзіця – малое. Б)**Ад'ектывацыя,** -і, жаночы род. Пераход іншых часцін мовы ў прыметнікі.



NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

**Фізкультхвілінка**

*Давайце ўстанем дружна, разам,*
*Уменні рухацца пакажам.*
*Так паглядзім улева, управа,*
*На месцы ўсе паскачам жвава,*
*І нахінёмся нізка-нізка,*
*Зноў станем прама, па-англійску.*
*Нарэшце удыхнём глыбока*
*І вернемся да тэмы ўрока.*

**III. Трэніровачна-карэкцыйны этап**. Выканайце на картках заданні, якія сустракаюцца на ЦЭ па беларускай мове.

**1 картка**

| | |
|---|---|
| А. Разнесці<br>Б. Вынаходлівасць<br>В. Наплечны<br>Г. Выхад | 1. Прыставачна-суфіксальны<br>2. Суфіксальны<br>3. Асноваскладанне<br>4. Прыставачны<br>5. Бяссуфіксны |
| А. Надрэчны<br>Б. Адшукаць<br>В. Прыезд<br>Г. Удзячнасць | 1. Прыставачны<br>2. Суфіксальны<br>3. Прыставачна-суфіксальны<br>4. Бяссуфіусны<br>5. Асноваскладанне |
| А. Пераправа<br>Б. Дзяржкантроль<br>В. Зверху<br>Г. Дарожны | 1. Суфіксальны<br>2. Асноваскладанне<br>3. Абрэвіяцыя<br>4. Бяссуфіксны<br>5. Прыставачна-суфіксальны |

**2 картка**

| | |
|---|---|
| А. Дадому<br>Б. Аптэчны<br>В. Ахова<br>Г. Спецкурс | 1. Абрэвіяцыя<br>2. Прыставачна-суфіксальны<br>3. Суфіксальны<br>4. Бяссуфіксны<br>5. Асноваскладанне |
| А. Хто-небудзь<br>Б. Разгляд<br>В. Зарэчны<br>Г. Зменлівасць | 1. Прыставачны<br>2. Суфіксальны<br>3. Бяссуфіксны<br>4. Постфіксальны<br>5. Прыставачна-суфіксальны |
| А. Водатрывалы | 1. Суфіксальны |



NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

| | |
|---|---|
| Б. Бясследны<br>В. Падборка<br>Г. Надбудаваць | 2. Прыставачны<br>3. Асноваскладанне<br>4. Бяссуфіксны<br>5. Прыставачна-суфіксальны |

**3 картка**

| | |
|---|---|
| А. Пасылка<br>Б. Словаўжыванне<br>В. Зварыць<br>Г. Узбярэжны | 1. Суфіксальны<br>2. Бяссуфіксны<br>3. Прыставачны<br>4. Асноваскладанне<br>5. Прыставачна-суфіксальны |
| А. Абкатка<br>Б. Падлёдка<br>В. Вогнеўстойлівы<br>Г. Выпрасіць | 1. Асноваскладанне<br>2. Суфіксальны<br>3. Прыставачна-суфіксальны<br>4. Прыставачны<br>5. Бяссуфіксны |
| А.Раслінны<br>Б.Дапамога<br>В.Напалову<br>Г.Медперсанал | 1. Прыставачна-суфіксальны<br>2. Асноваскладанне<br>3. Абрэвіцыя<br>4. Бяссуфіксны<br>5. Суфіксальны |

**Настаўнік**. Звернемся да эпіграфа.

Сцяжынак многа і дарог, як выбраць тую, што вядзе да шчасця?

Анатоль Балуценка.

Як вы разумееце выказванне паэта? *Адказы вучняў*.

Настаўнік. А мне б хацелася нагадаць вам словы В.А. Моцарта: “Цаніце кожнае імгненне, кожны дзень жыцця, бо гэта і ёсць самая галоўная навука – сапраўднае шчасце!”

Ці згодны вы з думкай, што, каб знайсці сваё шчасце ў жыцці, трэба да яго імкнуцца?

****Творчая работа.***

Паспрабуйце скласці сваё асабістае выказванне-разважанне пра шчасце і запішыце яго ў сшытках.

**Рэфлексія**.Падвядзенне вынікаў работы на стымулюючых занятках

Закончыце сказы:

Я запомніў, што…

Я зразумеў, што…

Думаю, што…

Цяжкім здалося…

Прабелы ў ведах буду ліквідаваць…



NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

**Настаўнік.** Завяршаецца наш урок-роздум над пытаннем “Што такое шчасце?”

Аднак мне хацелася б, каб у сэрцы кожнага з вас запаліўся агеньчык шчасця, які будзе асвятляць і саграваць ваш жыццёвы шлях.

Перад вамі – тры шляхі, тры жыццёвыя лёсы. На кожным з іх сваё шчасце.

Па першай дарозе ідзе той, хто лічыць за шчасце любоў да сябе, славу, багацце, уладу, неабмежаваную свабоду.

Па другой дарозе крочыць той, хто ўвогуле не верыць у шчасце, лічыць яго выдумкай.

Трэцюю дарогу выбіраюць тыя, хто пад шчасцем разумее служэнне людзям і Радзіме, магчымасць мець добрую сям’ю, верных сяброў, каханне, здароўе, магчымасць займацца любімай справай.

Якую дарогу выбраць – няхай вырашыць кожны з вас самастойна і асветліць яе маленькім агеньчыкам шчасця. Засланяйце гэты агеньчык ад жыццёвых сцюжаў і нягод і памятайце: “Чалавек – сам каваль свайго шчасця”.

Дзякую ўсім за работу. Будзьце шчаслівымі, ніколі не спыняйцеся на дасягнутым.

## Літаратура

Об организации в 2025/2026 учебном году образовательного процесса при изучении учебных предметов и проведении факультативных занятий при реализации образовательных программ общего среднего образования»: Инструктивно-методическое письмо Министерства образования Республики Беларусь. – Дадатак 2. Асаблівасці арганізацыі адукацыйнага працэсу пры вывучэнні вучэбных прадметаў “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура”.



NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА